ВЫЖЫВУЦЬ САМЫЯ МОЦНЫЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Дарэчы, яшчэ параўнальна нядаўна справы з прыдарожным сэрвісам ішлі даволі сумна. Памятаецца, гадоў пяць ці шэсць таму знаёмы масквіч расказваў, як з'ездзіў да нас на машыне. «Мы спадзяваліся, што хоць на галоўнай нацыянальнай трасе Беларусі ў прыдарожных кафэ зможам пакаштаваць якія-небудзь нацыянальныя беларускія стравы, каб было і смачна, і танна, і з пажаданнем «смачна есці». Дык вось: не, не і яшчэ раз не! — усклікаў знаёмы. — Ва ўсіх прыдарожных кафэ нам прапаноўвалі толькі разагрэць нешта незразумелае і абяцалі пасмажыць, мабыць, нацыянальную беларускую страву — шашлык. Беларусы, вы што, развучыліся гатаваць? Дзе варэнікі, дзе дранікі, дзе вашы супы? Мінскія каўбаскі мы ў выніку пакаштавалі ў кавярні на тэрыторыі Смаленскай вобласці»...

Аўтатурыст галасуе рублём

Цяпер, як сцвярджаюць спецыялісты, сітуацыя мяняецца. Беларускі рынак ужо досыць насычаны рознымі аб'ектамі прыдарожнага сэрвісу. Адлегласць паміж прыдарожнымі пунктамі харчавання — 30—60 кіламетраў. І там можна смачна і адносна нядорага паесці. Як паведамілі нам у аддзеле грамадскага харчавання Белкаапсаюза, больш за 20 % аб'ектаў на рэспубліканскіх трасах належыць спажывецкай кааперацыі. Кіроўцаў і аўтатурыстаў абслугоўвае 96 кааператыўных аб'ектаў грамадскага харчавання. Цяпер праводзіцца сур'ёзная работа як па ўстаноўцы сучаснага тэхналагічнага абсталявання, так і па папулярызацыі нацыянальнай кухні. Акрамя таго, у шэрагу аб'ектаў устаноўлены душавыя кабіны, арганізаваны пакоі адпачынку, гатэльныя нумары. А вясной і летам працуюць летнія пляцоўкі. Напрыклад, усе гэтыя паслугі даступныя ў кафэ «На скрыжаванні» Іўеўскага філіяла, кафэ «Мёд» Іванаўскага райспажыўтаварыства, кафэ «Ежа Кава» Докшыцкага райпа, «Гасцінны двор» Лідскага філіяла, рэстаране «Партызанскі бор» Лагойскага райпа і іншых.

Спецыялісты сцвярджаюць, што ва ўсіх аб'ектах прыдарожнага сэрвісу спажывецкай кааперацыі можна пакаштаваць «страву тыдня» па зніжанай цане. Са страў беларускай кухні, на іх думку, найбольш запатрабаваныя дранікі, фаршаваныя мясам або грыбамі, каўбаскі па-сялянску з грэцкай кашай, бульбяныя клёцкі, бульбяная бабка, піражкі з грыбамі і некаторыя іншыя. Не адстаюць ад Белкаапсаюза і прыватнікі.

І на магістральных, і на рэспубліканскіх дарогах выконваюцца рэкамендаваныя адлегласці для аб'ектаў сэрвісу аднаго віду. Так, сёння для АЗС гэта 42 км, для аб'ектаў грамадскага харчавання — 30 км.

У сваю чаргу, **начальнік упраўлення развіцця аўтадарог галоўнага ўпраўлення аўтамабільных дарог Мінтранса Сяргей ЛЯВОНЧЫК** адзначае, што гаворка пра будаўніцтва новых прыдарожных аб'ектаў ужо не ідзе. У нас, паводле слоў спецыяліста, як у высокаразвітых краінах, на першы план цяпер выходзіць канкурэнцыя, у выніку якой выжывуць самыя моцныя. У гэтай сферы, па словах Сяргея Лявончыка, пачалі працаваць рынкавыя механізмы. А наведвальнік, як заўсёды, галасуе рублём. Ён заязджае ў тое месца, дзе яму камфортна і зручна, нядорага і смачна. Таму ў выніку канкурэнтнай барацьбы наш прыдарожны сэрвіс паступова ўдасканальвае свае паслугі.

— Мы пачыналі з такіх абавязковых патрабаванняў да прыдарожнага сэрвісу, як санітарныя збудаванні, пункты харчавання і стаянка для аўто, — кажа Сяргей Лявончык. — Прадпрымальнікі змаглі іх забяспечыць. Цяпер хочам, каб на аб'ектах былі бясплатны Wi-Fi, зніжкавыя праграмы, карты лаяльнасці. Каб санвузел быў не адзін, а некалькі. Каб былі забяспечаны ўмовы для адпачынку дзяцей у памяшканні і на вуліцы. Калі ёсць турыстычны патэнцыял, значыць, патрэбныя даведнікі, сувенірная прадукцыя... Гэтыя думкі ляжаць у аснове новай канцэпцыі, а далей будзем прыдумляць нейкія іншыя элементы.

У цэлым, як адзначае Сяргей Лявончык, у генеральнай схеме развіцця прыдарожнага сэрвісу прадугледжаны тры ўзроўні аб'ектаў. Да аб'ектаў першага ўзроўню належаць пляцоўкі для адпачынку з добраўпарадкаваным санітарным збудаваннем, да другога ўзроўню — тыя ж пляцоўкі адпачынку, але ўжо з пунктам харчавання. Аб'екты трэцяга ўзроўню, акрамя ўсяго гэтага, павінны мець таксама аўтазаправачную станцыю. Пры гэтым міністэрства не абмяжоўвае спіс зручнасцяў — кожны ўладальнік аб'екта можа пашыраць яго, дадаючы, напрыклад, гасцінічныя паслугі, тэхабслугоўванне.

На пачатак 2019 года на рэспубліканскіх дарогах функцыянавала 414 аўтазаправачных станцый, 159 газазаправачных пунктаў, 72 гасцініцы, 45 аўтамыек, 101 ахоўная стаянка, 586 пунктаў грамадскага харчавання, 74 пункты тэхнічнай дапамогі і СТА.

Ужо цяпер на некаторых аўтазаправачных станцыях кліентам прапануецца шырокі пералік паслуг, сярод якіх станцыі тэхнічнага абслугоўвання, шынамантаж і балансаванне колаў, аўтаматычная і ручная мыйкі аўтамабіляў, даліванне вадкасці ў бачок амывальніка, крамы і кавярні, гасцініцы, стаянкі для легкавых аўтамабіляў.

У Мінтрансе лічаць, што такіх аб'ектаў павінна рабіцца больш. «Мы бачым, што далейшае развіццё прыдарожнага сэрвісу будзе арыентавана менавіта на комплексныя аб'екты. Каб чалавек мог спыніцца ў дарозе, заправіць аўтамабіль, адпачыць, паесці», — адзначыў Сяргей Лявончык.

Святлана БУСЬКО.

❍ Каментарый у тэму

Кансультант аддзела метадалогіі кіравання арганізацыі гандлю і грамадскага харчавання Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Анастасія ЕРАХАВЕЦ:

— За апошнія паўтара года ў сельскай мясцовасці адкрылася больш за 300 аб'ектаў гандлю. У нас дзейнічае Указ Прэзідэнта № 345 «Аб развіцці гандлю, грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання», якім прадугледжаны шэраг ільгот і прэферэнцый (для арэндадаўцаў гандлёвых аб'ектаў на сяле). Напрыклад, спецыяльны рэжым падаткаабкладання на перыяд з 1 студзеня 2018 года да 31 снежня 2022 года, льготы пры адчужэнні аб'ектаў нерухомай маёмасці ў сельскай мясцовасці і на тэрыторыі малых гарадскіх паселішчаў. У цяперашні час дзеянне ўказа распаўсюджваецца амаль на 19 тысяч населеных пунктаў, у тым ліку аграгарадкі, што складае 80 % сельскіх населеных пунктаў краіны. За перыяд дзеяння ўказа з'явілася 306 аб'ектаў рознічнага гандлю і 61 аб'ект грамадскага харчавання.

На колах

Трыццаць адзін кіламетр на веласіпедзе

Мінскі абласны веласіпедны тур адбыўся ў Мядзельскім раёне. Маршрут склаў трыццаць адзін кіламетр па шашы і перасечанай мясцовасці. Усяго на веласіпеды селі 600 чалавек. Мерапрыемства прысвечана Году малой радзімы і 75-й гадавіне вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Стартаваў тур у дзіцячым цэнтры «Зубраня». Яго ўдзельнікі зрабілі два прыпынкі — у курортным пасёлку Нарач і каля помніка ў вёсцы Мінчакі воінам, загінулым у гады Вялікай Айчыннай вайны. Там былі ўскладзены кветкі. Галоўная ідэя мерапрыемства — не толькі папулярызацыя здаровага ладу жыцця, але і выхаванне беражлівых адносін да памяці абаронцаў Айчыны.

Усяго ў заездзе прыняло ўдзел больш за трыццаць камандаў: работнікі структурных падраздзяленняў Мінаблвыканкама, апаратаў гар-і райвыканкамаў, старшыні раённых і Жодзінскага гарадскога Саветаў дэпутатаў, прадстаўнікі сілавых структур, прадпрыемстваў і арганізацый, грамадскіх аб'яднанняў.

Пасля заканчэння туру яго ўдзельнікаў і жыхароў райцэнтра чакаў канцэрт на набярэжнай возера Мястра на сцэне амфітэатра.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

БелВЭБ

Сведения о результатах проведения рекламной игры

«Открой мир путешествий!»

Организатор рекламной игры: Общество с ограниченной ответственностью «Мятный знак». УНП 192325716, 220030, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Октябрьская, 19Б, оф. 6, этаж 3.

Наименование рекламной игры: «Открой мир путешествий!!».

Территория проведения: Республика Беларусь.

Срок начала и окончания рекламной игры: игра проводится с 01.03.2019 г. по 29.07.2019 г., включая период розыгрыша и вручения призов.

Сведения о государственной регистрации рекламной игры: игра зарегистрирована в Министерстве антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь (свидетельство о государственной регистрации № 3491 от 25 февраля 2019 года).

Сведения о количестве участников рекламной игры: в игре приняли участие 654 (шестьсот пятьдесят четыре) человека.

Сведения о розыгрыше призового фонда: призовой фонд (18 призов), общий размер которого составляет 9992 (девять тысяч девятьсот девяносто два) белорусских рубля 49 копеек разыгран полностью.

Список победителей 1-го розыгрыша:

Приз второй категории – Сумка кожаная Versado 060 + денежное вознаграждение в размере возмещения подоходного налога за Призы второй категории – 10,31 бел. руб.:

Белявская Оксана Николаевна, г. Минск

Савенко Геннадий Эдуардович, г. Минск

Артеменко Артем Артемович, г. М. Горка

Воюнков Вадим Александрович, д. Губичи

Игнатьев Максим Александрович, г. Мосты.

Главный Приз – Подарочный сертификат на оказание туристических услуг (со сроком действия до 29.07.2020 г.) + денежное вознаграждение в размере возмещения подоходного налога за Главные Призы – 279,28 бел. руб.:

Кучеров Сергей Викторович, г. Бобруйск.

Список победителей 2-го розыгрыша:

Приз второй категории – Сумка кожаная Versado 060 + денежное вознаграждение в размере возмещения подоходного налога за Призы второй категории – 10,31 бел. руб.:

Жданович Анатолий Геннадьевич, г. Минск

Кулешова Татьяна Ивановна, г. Кобрин

Мысовских Сергей Анатольевич, г. Борисов

Купцов Геннадий Александрович, г. Минск

Гриневич Сергей Иванович, г. Минск.

Главный Приз – Подарочный сертификат на оказание туристических услуг (со сроком действия до 29.07.2020г.) + денежное вознаграждение в размере возмещения подоходного налога за Главные Призы – 279,28 бел.руб.:

Багнюк Олег Владимирович, г. Молодечно.

Список победителей 3 розыгрыша:

Приз второй категории – сумка кожаная Versado 060 + денежное вознаграждение в размере возмещения подоходного налога за Призы второй категории – 10,31 бел. руб.:

Бабушкина Анна Алексеевна, г. Светлогорск

Воронова Оксана Анатольевна, д. Рагозы

Войтик Лариса Дмитриевна, г. Барановичи

Тузов Геннадий Михайлович, д. Загорцы

Сафонов Юрий Александрович, г. Минск.

Главный приз – подарочный сертификат на оказание туристических услуг (со сроком действия до 29.07.2020 г.) + денежное вознаграждение в размере возмещения подоходного налога за Главные Призы – 279,28 бел. руб.:

Панкевич Дмитрий Леонтьевич, г. Минск.

Поздравляем победителей!

Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры: +375 29 68 55 110.

Ну і ну!

Злодзея знайшлі па... ўпакоўцы ад семак

У Брэсце праваахоўнікі высветлілі асобу зламысніка па... упакоўцы ад семак, паведаміла БелТА афіцыйны прадстаўнік упраўлення Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз па Брэсцкай вобласці Таццяна КАТОК.

У органы ўнутраных спраў з заявай аб крадзяжы звярнуўся брастаўчанін. Мужчына паведаміў, што з дзіцячай каляскі ў пад'ездзе шматкватэрнага дома знік кашалёк з грашыма, які ён выпадкова пакінуў там пасля вячэрняй прагулкі з дзіцем. Адсутнасць кашалька гаспадар выявіў толькі раніцай наступнага дня.

На месца здарэння была накіравана следча-аператыўная група з удзелам спецыяліста ДКСЭ. Сярод рэчаў, якія знаходзіліся ў кішэні дзіцячай каляскі, доказы выявіць не ўдалося. Пры аглядзе тэрыторыі каля дома міліцыянеры знайшлі ўпакоўку ад семак. Па словах пацярпелага, на момант крадзяжу яна была ў дзіцячай калясцы разам з кашальком. Пры даследаванні ўпакоўкі эксперту ўдалося выявіць адбіткі пальцаў жыхара Жабінкаўскага раёна. Супрацоўнікі міліцыі затрымалі падазраванага.Частка выкрадзенага канфіскавана.

Брэсцкі міжраённы аддзел Следчага камітэта ўзбудзіў крымінальную справу па арт. 205 (крадзеж) Крымінальнага кодэкса. Санкцыя артыкула прадугледжвае пакаранне ад грамадскіх работ або штрафу да пазбаўлення волі на тэрмін да трох гадоў.